РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**САРЭ́НЫ**, міфічныя істоты рознага полу, якія жывуць у моры, а ў пагодныя дні выходзяць на бераг. Лакальныя назвы Людзі марскія, Вадзяныя каралеўны, Фараонкі. Той, хто плавае па моры, можа бачыць Людзей марскіх. Паводле нар. уяўленняў, яны былі заклятыя Божай Маці, у выніку чаго атрымалі выгляд паўчалавека-паўрыбы. З мора чуваць, як яны пяюць, весяляцца ці плачуць, цягнучы журботныя песні. Жывуць у моры і Вадзяныя каралеўны, якія, выходзячы з вады ўночы, спяваюць. Запісаныя ад іх песні разыходзяцца па свеце. Паходжанне Фараонак тлумачыцца ў народзе так: «...як жыдэ пераходзілі без мора да нас, Фараон казаў усім людзям з свайго каралеўства ганіць жыдоў, жэбы іх не пусціць па гэты бок, то некаторыя, гонячы жыдоў, паўходзілі ў мора, і як Мойжэш лескаю махнуў, вада зышлася ў мору да мейсца і заліла іх там, і яны да канца свету будуць у мору». Для ўсіх гэтых міфічных персанажаў характэрна тое, што ў прахожых ці праезджых людзей яны пытаюцца пра час сканчэння свету. Калі пачуюць, што ён адбудзецца неўзабаве, — цешацца, пляскаюць у далоні, а калі ім скажуць, што не хутка, — плачуць, лементуюць, бо пасля канца свету з'явяцца іншыя людзі і С. давядзецца быць не ў вадзе, а на зямлі, з-за чаго замест хвастоў у іх паявяцца ногі, як у людзей.

*У. А. Васілевіч.*